**Р Э Ц Э Н З І Я**

**Рэцэнзія на кнігу А. Ф. Рогалева**
***«Географические названия в калейдоскопе времён». –***
**Гомель : Барк, 2008. – 256 с.**




Доктар філалагічных навук, прафесар Аляксандр Фёдаравіч Рогалеў доўгі час займаецца даследаваннямі ў галіне агульнай, гістарычнай і літаратурнай анамастыкі, сацыяльнай і этнічнай лінгвістыкі, лінгвістычнага краязнаўства. Асноўныя працы і іх назвы сведчаць пра навуковыя праблемы, якія даследаваў гэты лінгвіст: «Этнотопонимия Беларуси» (1993), «Белая Русь и белорусы» (1994), «Этнические и географические названия как источник для изучения этноязыковой истории (на материале Беларуси)» (1996), «От Гомиюка до Гомеля» (2006), «Имя и образ: художественная функция имён собственных в литературных произведениях и сказках» (2007). У новай кнізе даследчыка «Географические названия в калейдоскопе времён» у лаканічных, але змястоўных нарысах апавядаецца пра паходжанне шматлікіх геаграфічных назваў Беларусі (у прыватнасці тых, якія не атрымалі падрабязнага апісання ў папярэдніх выданнях аўтара): *Белая Русь*, *Баранавічы*, *Барысаў*, *Браслаў*, *Буда-Кашалёва*, *Быхаў*, *Вербавічы*, *Грыдні*, *Докшыцы*, *Драгічын*, *Івянец*, *Карэлічы*, *Мір*, *Ліда*, *Лагойск*, *Мар'іна Горка*, *Мінск*, *Магілёў*, *Маладзечна*, *Нароўля*, *Петрыкаў*, *Пінск*, *Паставы*, *Пружаны*, *Слонім*, *Старыя Дарогі*, *Чашнікі*, *Шклоў* і інш.

У тапаніміі любога рэгіёна адлюстроўваюцца этапы развіцця матэрыяльнай і духоўнай культуры народа-стваральніка. На тэрыторыі сучаснай Беларусі сумесна пражывалі прадстаўнікі розных нацыянальнасцей, таму тапанімія нашай краіны ўяўляе сабой яскравы прыклад рэалізацыі прынцыпаў міжнароднай камунікацыі, пра што слушна адзначае А. Рогалеў у прадмове: «В наши задачи входит и установление связи рассматриваемых топонимов с конкретными событиями, исторической эпохой, соответствующей этнической и культурной средой. Нас интересует также обусловленность географических названий мировосприятием создававших их людей» [с. 8]. Таксама ў пачатку кнігі аўтарам падаюцца агульныя звесткі пра ўласныя найменні ў параўнанні з агульнымі, звяртаецца ўвага на апелятывацыю (пераход уласных імёнаў у агульныя).

Адкрывае «Географические названия в калейдоскопе времён» нарыс, прысвечаны тлумачэнню тапоніма *Белая Русь*. Цяжкасці ў дакладным вызначэнні паходжання гэтай адзінкі звязаны перш за ўсё з нестабільнасцю межаў тэрыторыі, якая ідэнтыфікавалася такой назвай. У працэсе гісторыка-лінгвістычнага аналізу, не палемізуючы з іншымі аўтарамі, А. Рогалеў паслядоўна, з энцыклапедычнай шырынёй разглядае генезіс тапоніма Белая Русь (нарыс мае некалькі раздзелаў: «Имя Белая Русь в контексте этнополитической истории русской земли», «Из письменных источников», «Две Белые Руси», «У истоков Белой Руси», «Другие "следы" русов и поморских славян на землях Беларуси»). Які погляд найбольш прымальны, дапытлівы чытач вызначыць для сябе сам, але бясспрэчным застаецца тое, што пачатак назвы *Белая Русь* у вытоках нашай гістарычнай памяці. У любым выпадку гэтае імя – адзін з элементаў славянскай духоўнай культуры [с. 24].

Вядома, што вывучэнне ўласных імёнаў немагчыма толькі ў межах лінгвістыкі, таму ў сваёй кнізе А. Рогалеў звяртаецца да матэрыялаў розных сумежных навук, перш за ўсё гістарычных, і пры неабходнасці аналізуе факты ў некалькіх аспектах – лінгвістычным, этналінгвістычным, гістарычным, геаграфічным і міфалагічным. У адным з нарысаў такі комплексны падыход адлюстраваны ўжо ў самой назве «Исторический Лукомль и сказочное

МГПУ им. И.П. Шамякина

лукоморье». Паводле археалагічных даследаванняў, можна меркаваць, што паселішча на рэчцы *Лукомцы* існавала ўжо ў IX стагоддзі і з'яўлялася крэпасцю крывічоў. У X–XIII стст. Лукомль быў горадам Полацкай зямлі [с. 104]. Такім чынам, айконім *Лукомль* узнік ад гідроніма *Лукома*. Аднак аўтар не выключае і міфалагічную падаснову гэтага тапоніма. «Слово *лукоморье* известно нам прежде всего из поэмы А. Пушкина “Руслан и Людмила”, которая начинается словами: “У лукоморья дуб зелёный”. Искать на карте пушкинское лукоморье бесполезно. Это абстрактная данность сказочного пространства» [с. 105]. Далей А. Рогалеў падае аналіз архетыпаў, якімі напоўнены карціны, створаныя А. Пушкіным. Заканчваецца ж нарыс храналагічным апісаннем гісторыі *Лукомля* і тлумачэннем айконіма *Новалукомль*.

Цікавы і аргументавана змястоўны нарыс «Заклятая река», у якім прыведзена некалькі паданняў пра гісторыю знікнення рэк і азёраў на Беларусі. Большасць сюжэтаў звязана з вобразам-сімвалам маладога хлопца *Янкі*, паколькі гэтае імя для ўсходніх славян з'яўляецца абагуленым найменнем чалавека ўвогуле. Напрыклад, паводле адной гісторыі, маці-чараўніца жорстка пакарала раку за згубу свайго любімага сына Янкі. У выніку – рака знікла. Такое распаўсюджанае ў розных межах краіны закляцце водных аб'ектаў А. Рогалеў лічыць казачным пераасэнсаваннем шкоднаснага ўздзеяння чалавечай цывілізацыі на прыроду [с. 98].

Асаблівую ўвагу, на наш погляд, уяўляе нарыс, прысвечаны тапаніміі рэгіёнаў, пацярпелых ад Чарнобыльскай катастрофы («Гридни. Вербовичи. Наровля. Топонимия “раненой” земли»). Аўтар разглядае не толькі паходжанне назваў «чарнобыльскіх» вёсак і мястэчкаў, але і этымалогію мікратапонімаў (назваў дробных, невялікіх аб'ектаў – палёў, узлескаў, гаёў, палянак і інш.: *Баба*, *Барысава Гара*, *Ваўкаўня*, *Казініца*, *Начніцы*, *Цароў Астраў* і г. д.). Нягледзячы на тое, што многія з гэтых назваў могуць ужо не трапіць на геаграфічную карту Беларусі (нават самую падрабязную), яны ўсё ж такі частка нашай гісторыі. Як нам здаецца, для поўнага апісання тапанімічных назваў Нараўлянскага раёна варта было б выкарыстаць артыкул ураджэнкі Нараўляншчыны, дацэнта Л. Жураўскай «Тапаніміка Нараўлянскага раёна», змешчаны ў навукова-метадычным зборніку «Актуальныя праблемы моўнай адукацыі вучняў ва ўмовах рэфармавання агульнаадукацыйнай школы». – Мазыр, 2001. – С. 27–31.

У працэсе паслядоўнага і падрабязнага выкладу багатага фактычнага матэрыялу, апублікаванага не толькі ў гэтай змястоўнай кнізе, А. Рогалеў прыйшоў да высновы, што для тлумачэння айконімаў і іншых анамастычных адзінак першаснае значэнне мае асэнсаванне таго гісторыка-культурнага фону, на якім адбываецца «нараджэнне» імя [с. 250].

Такім чынам, кніга А. Рогалева «Географические названия в калейдоскопе времён» напісана з грунтоўным і ўсебаковым аналізам, яе можна разглядаць як энцыклапедычны даведнік па тапаніміі. Пасля кожнага нарыса падаецца падрабязны спіс літаратуры, што, безумоўна, дапаможа зацікаўленаму чытачу ўсебакова пазнаёміцца з гісторыяй утварэння таго ці іншага паселішча, яго назвы. Кніга будзе карыснай у выкладанні гісторыі, геаграфіі Беларусі, роднай мовы, літаратуры, пры правядзенні пазакласных мерапрыемстваў, асабліва краязнаўчых экскурсій і інш.

*В. В. Шур,*
*доктар філалагічных навук, прафесар,*
*загадчык кафедры беларускага мовазнаўства*
*УА МДПУ імя І. П. Шамякіна;*

*Г. В. Юдзянкова,*
*магістр філалагічных навук,*
*аспірантка кафедры беларускага мовазнаўства*
*УА МДПУ імя І. П. Шамякіна*

МГПУ им. И.П.Шамякина